ДЗВІНСКІ ЎЗГОРАК

*Кроч на свой родны,
дзвінскі ўзгорак,
каб глядзець
у будучую сінь*

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №18 (123)
ЛІСТАПАД 2020 ГОДА

МЯСЦОВАЯ ЎЛАДА

ОТЧЕТ ПРО ЖИЗНЬ В РАЙОНЕ

С отчетом о своей деятельности, работе президиума и о положении дел на территории Витебского района за 9 месяцев выступил глава депутатского корпуса Виктор Дорожкин.

На сессии были рассмотрены вопросы обеспечения жизнедеятельности в населенных пунктах, развития личных подсобных хозяйств, благоустройства агрогородков и деревень, наведения порядка на земле, обращения граждан.

На постоянном контроле районного Совета депутатов, райисполкома, сельских Советов находятся вопросы ведения личных подсобных хозяйств граждан. Значительная помощь оказывается в виде услуг по обработке земель, уборке урожая, доставке дров и торфобрикета, выделению сенокосов и пастбищ, реализации семян, в заготовке грубых кормов. В этом году на приусадебных участках убрано более 212 га зерновых, намолочено более 536 тонн зерна.

Особое место в системе ведения личных подсобных хозяйств занимает закуп молока у населения. За 9 месяцев 2020 г. закуплено 162,8 тонны молока или 105,3% к уровню 2019 года. В целях стимулирования развития личных подсобных хозяйств на государственном уровне обеспечена выплата надбавок к закупочной цене за молоко и молодняк крупного рогатого скота до 100 кг живого веса.

«Производство и реализация гражданами собственной сельскохозяйственной продукции — это один из источников доходов сельчан. Поэтому задача органов местной власти, потребкооперации, сельхозорганизаций — создание оптимальных условий для развития данного направления», — отметил председатель районного Совета депутатов Виктор Дорожкин.

Постоянно в центре внимания находятся вопросы благоустройства населенных пунктов и наведения порядка на земле. В районе налажена практика проведения совместных подворовых обходов активами сельских Советов, зональным центром гигиены и эпидемиологии, районными отделами по чрезвычайным ситуациям и внутренних дел с целью напоминания о необходимости приведения в надлежащее санитарное состояние придомовых территорий с выдачей предписаний.

Повсеместно проведены субботники по наведению порядка на земле. Продолжены работы по благоустройству сельских улиц и кладбищ, дорог и производственных территорий, ликвидации аварийных деревьев, сносу ветхих домов, ремонту и установке ограждений; проводится культивирование бросовых земельных участков и вовлечение их в севооборот.

За текущий период года в населенных пунктах установлено 120 малых архитектурных форм (беседки, скамейки, цветники и прочее), высажено 3177 деревьев, 712 кустарников, более 31 тыс. цветов. Вырублено более 370 сухих и аварийных деревьев, удалено порядка 710 га сорной растительности. Вовлечено в оборот более 1810 га земель сельскохозяйственного назначения.

Особое внимание уделяется контролю за землями, расположенными вдоль автомобильных дорог. Благодаря совместной работе сельисполкомов, сельхозпредприятий и дорожных служб выполнены работы по раскорчевке древесно-кустарниковых насаждений на площади 56 га.

Важной составляющей работы по благоустройству является уничтожение очагов произрастания борщевика Сосновского. В итоге на территории района это коварное растение удалено на площади 968,02 га (годовой план 748,32 га) с учетом повторных работ.

В рамках действия Указа Президента Республики Беларусь № 357 «О пустующих и ветхих домах» в прошлом году снесен 41 пустующий и ветхий дом, за 9 месяцев этого года — 26.

Ведется работа по предотвращению несанкционированных свалок, особенно на территории садоводческих товариществ. Одним из направлений по недопущению образования свалок мусора является использование фотоловушек, количество которых планируют увеличить лесхозы и дорожные службы.

Сессия районного Совета депутатов с учетом внесения изменений и дополнений утвердила проекты решений по рассмотренным вопросам.

Ольга ВИКТОРОВА
"Жыццё Прыдзвіння"

COVID-19

ВВЕДЕН МАСОЧНЫЙ РЕЖИМ

Витебский райисполком принял решение «О вводе режима использования средств индивидуальной защиты».

В соответствии с ним режим использования средств индивидуальной защиты (маски) населением Витебского района вводится на следующих объектах организаций всех форм собственности: магазины, объекты торговли и общественного питания, бытового обслуживания, аптеки, учреждения здравоохранения, социального обслуживания населения, спортивные объекты, административные здания, отделения банков, почты, учреждения культуры, общественный транспорт, в том числе маршрутное такси.

Организация и контроль за использованием средств индивидуальной защиты органов дыхания и выполнение других профилактических мероприятий возложены на руководителей объектов, организаций.

Комплексный план мероприятий по предупреждению распространения инфекции COVID-19 в г. Витебске в период подъема заболеваемости острыми респираторными инфекциями, утвержденный решением Витебского горисполкома от 20.10. 2020 г. № 1176, дополнен п. 24, согласно которому с 12 ноября вводится режим использования средств индивидуальной защиты органов дыхания (маска) населением на следующих объектах организаций всех форм собственности: магазины, торговые центры, аптеки, учреждения здравоохранения, общественный транспорт, в том числе маршрутное такси.

А.Адамов

ПАМЯЦЬ

НАВЕДАЛІ МЕСЦЫ РАССТРЭЛАЎ

4 лістапада сябры грамадскай ініцыятывы «Хайсы» наведалі ў ваколіцах Віцебску месцы расстрэлаў і пахавання рэпрэсаваных грамадзян падчас сталінскіх рэпрэсіяў.

Дзень быў выбраны не выпадкова: 4 лістапада 1937 году ў Віцебску расстралялі 110 чалавек, сярод якіх былі мастакі Янка Гаўрыс, Яўхім Мінін, браты Пётр і Хрыстафор Даркевічы...

Свой жалобны шлях грамадскія актывісты пачалі з наведвання вясковых могілак у вёсцы Мазалава. Там у 2018 годзе мясцовыя ўлады пахавалі парэшткі 302 рэпрэсаваных, знойдзеныя ў «расстрэльным лесе» ля вёскі Хайсы вайскоўцамі 52-га пошукавага батальёну. Поруч з афіцыйным крыжам актывісты паставілі свой, удакладнілі на шыльдачцы, каму належаць знойдзеныя ля Хайсоў чалавечыя парэшткі.

Не прамінулі сябры ініцыятывы ўсклаці кветкі і памянуць добрым словам жыхара Хайсоў **Змітра Ганчарова**, які пахаваны непадалёку ад брацкай магілы ахвяраў сталінізму і які быў жывым сведкам знішчэння рэпрэсаваных у хайсоўскім лесе.

На вайсковым мемарыяле ля чыгуначнай станцыі Лосвіда актывісты ўсклалі кветкі да магілы рэпрэсаваных. У 2017 годзе, пад выглядам ахвяраў вайны, мясцовыя ўлады перапахавалі там парэшткі, знойдзеныя пашукавікамі ў тым жа хайсоўскім лесе.

Лес пад Хайсамі ўвесь зеўрае зараз «расстрэльнымі» ямінамі, вакол якіх актывісты ўсталявалі драўляныя і металёвыя крыжы. Месца масавых расстрэлаў намаганнямі сяброў ініцыятывы і неабыякавых грамадзян ператворанае ў народны мемарыял.

Дзякуючы знаходкам вайскоўцаў, успамінам мясцовых жыхароў і працы з даступным гістарычным матэрыялам з вялікай доляй верагоднасці ўдалося вярнуць з нябыту імёны знішчаных грамадзян. Сярод іх – настаўніца **Вольга Данцыт**, старшыня калгасу **Антон Рамашка**, мастакі **Янка Гаўрыс**, **Яўхім Мінін**, браты **Пётр і Хрыстафор Даркевічы**.

Алена С. распавяла, што 4 лістапада 1937 году тут быў расстраляны і яе дзед. Ён не быў мастаком, ён не быў артыстам, а працаваў дарожным майстрам.

«Сваю ролю ў яго трагічным лёсе адыграла шляхецкае прозвішча – Сухорскі. Станіслаў быў звычайным каталіком, а з яго зрабілі сябра падпольнай польскай арганізацыі вайсковай. Жыў чалавек, займаўся выключна грамадзянскімі справамі.

У архіве я знайшла матэрыялы, з якіх вынікае, што ў 1925 годзе ён уладкоўваўся страхавым агентам. Пасля расстрэлу без бацькі застаўся мой дзядзька – Генрых Станіслававіч», – распавяла гісторыю свайго роду спадарыня Алена.

Напрыканцы актывісты наведалі Цёплы лес каля Лужасна. Там таксама расстрэльвалі рэпрэсаваных.

Некалькі гадоў таму былы прафесар Віцебскай ветэрынарнай акадэміі **Генадзь Сакалоў** распавёў гісторыю, як за некалькі гадоў да вайны ён, заінтрыгаваны расповедамі старэйшых хлопцаў, прыйшоў разам з імі паглядзець, як забіваюць людзей. Тая цікаўнасць ледзь не скончылася трагедыяй, але хлопцы, напалоханыя стрэламі энкавэдэшнікаў, здолелі ўцячы...

С. Горкі
"Віцебская вясна"

ЭКАЛОГІЯ

АКЦЫЯ «ПАСАДЗІ ДРЭВА»

Калектыў Заронаўскага дзіцячага сада Віцебскага раёна не толькі словам выхоўвае ў дзетак патрыятызм, але і справай. У пачатку лістапада тут прайшла акцыя «Пасадзі дрэва». Любоў да прыроды прывіваецца дзецям з маленства. Любіць прыроду — любіць свой край, сваю малую радзіму.

Дзень выдаўся сонечным. Прырода спрыяла заронаўцам у правядзенні важнай і патрэбнай справы. Выхаванцы садка разам са сваімі роднымі (прыйшлі мамы з татамі, бабулі) садзілі свае елачкі. Прыемна было назіраць, як малыя стараліся дапамагаць.

Данік Клятчанка першым пасадзіў сваю елачку разам з мамай і татам. Саша Сокалаў нават сваю маленькую лапатку прынёс, каб з мамай пасадзіць дрэўца. Дзве сястрычкі Яўчанкі, Мілана і Міраслава, увішна цягнулі елачкі да ямкі, якую выкапаў іх тата Аляксей, нават ад бабулінай дапамогі адмаўляліся. Пыхцеў і Яраслаў Мяшкоў, забіраючы лапату ў сваіх бацькоў, бо сам хацеў выкапаць ямку. Дзяўчаткі Маша Жукавец, Мілана Кастаненка і Ульяна Шыбека старанна прысыпалі зямлёю свае саджанцы, каб яны прыжыліся.

Мацвей Шыбека спачатку баяўся елачкіных калючак, але пасля пасмялеў і дапамагаў свайму бацьку. Сямейнае дрэва садзілі Насця Бадрылава са стрыечным братам Яраславам Гаўрыленкам з дапамогай сваіх бацькоў. А вось пасадку дрэва пакаленняў, якое высадзілі былы выхаванец Аляксей Яўчанка і выхавальнік садка Алена Уладзіміраўна Драйліх, яшчэ суправадзілі прыемнымі ўспамінамі з гісторыі нашай дашкольнай установы.

Загадчыца Аксана Яўгенаўна Замастоцкая была абрадавана актыўнасцю бацькоў і зробленай справай, яна таксама пасадзіла сваё дрэўца.

Будуць расці дзеці, а разам – і іх дрэвы.

Што сімвалічна: палова дарослых, што прымалі ўдзел, – гэта былыя выхаванцы садка. Яны выраслі, завялі сем'і, а зараз іх дзеткі наведваюць тую ж дашкольную ўстанову. А пасаджаныя дрэўцы будуць расці і чакаць новае пакаленне заронаўскай дзятвы.

Людміла Нікіціна

ПАМЯТАЦЬ!

«МЫ ЖИВЕМ В КОНЦЛАГЕРЕ»

Жители Витебска 13 ноября почтили память умершего 31-летнего минчанина Романа Бондаренко, который вышел защитить от срывания бело-красно-белые ленты на заборе во «дворе перемен» – и умер в больнице после того, как его избили. Не обошлось без задержаний.

Примерно 70 витеблян собрались возле памятника «Боль» на пересечении улиц Воинов-интернационалистов и Чкалова. Люди несли белые и красные цветы, ставили у подножия монумента свечи, лампады, портреты Романа Бондаренко.

Позже рядом с фотографией Романа кто-то поставил портрет Александра Тарайковского – 34-летнего минчанина, который погиб 10 августа после выстрелов силовика во время мирной акции протеста возле станции метро «Пушкинская».

Памятник «Боль» посвящен 150 воинам, уроженцам Витебщины, погибшим в Афганистане. Скульптурная композиция представляет собой скорбящую мать на коленях, которая оплакивает погибшего сына. Рядом с монументом сооружена часовня.

— Мы приходим сюда каждый год, чтобы почтить память погибших в Афганистане. Прошло столько лет, закончилась та война, но здесь все равно всегда плачут матери. И я никогда не думала, что горожане соберутся здесь, чтобы скорбеть уже о своем современнике. И что это случится в мирное время, — говорит жительница Витебска Татьяна. — Ужасно сознавать, что Роман погиб только потому, что у него другое мнение, — не такое, как у тех, кто защищает действующую власть.

К памятнику подошел мужчина, поставил свечу.

— Роману был 31 год. Моему сыну — 25. Кто следующий? — обратился он ко всем.

— Любой из нас, — ответил кто-то.

Многие девушки и женщины заплакали.

— Минск сказал, что не сдастся, пойдет до конца. Сейчас всем задержанным дают по 10—12—15 суток. Но за каждого арестованного сына или дочь выйдет мать или отец, — говорила женщина средних лет.

— Конечно. С нами уже случилось все — мы живем в концлагере. Но жить в нем больше не хотим.

Милиция патрулировала ближайшую территорию, но в происходящее не вмешивалась. Неизвестный в штатском снимал собравшихся на видео.

К нему подошла девушка с портретом Романа Бондаренко.

— Мы все пришли сюда, чтобы почтить память Романа. А вы зачем сюда пришли? Мы вас боимся, но все равно выходим. И будем выходить.

Мы спросили у нескольких жительниц Витебска, что привело их к памятнику «Боль» в полдень буднего дня.

— Почтить память Романа — это долг каждого, кто адекватно оценивает ситуацию в стране. Я не ходила раньше на мирные акции протеста — боялась. А сегодня решила: я больше не боюсь! — признается Ольга.

— Для меня это личное горе. Я полночи рыдала, — говорит Юлия. — Смерть Романа ничем нельзя оправдать, просто ничем. Он — молодой человек, мой ровесник. Мне очень стыдно перед матерью Романа, что мы, белорусы, допустили его смерть.

— Я выходила раньше на шествия, но шла молча. Потому что понимала, что власть нас не слышит — она слепа и глуха. А сегодня меня прорвало: вчера, после смерти Романа Бондаренко, была последняя капля в чаше терпения. Я не могла найти себе места от горя. А каково его родителям — потерять парня? — плачет Тамара. — Сегодня я прочитала, что власть пытается оболгать Романа, будто в его крови был алкоголь... От этой лжи страшно. Но я поняла: все, хватит белорусам бояться!

Через полчаса после начала скорбной акции горожане разошлись от памятника «Боль». Милиция никого не задерживала.

Примерно в это же время акция памяти в честь Романа Бондаренко прошла и возле соседнего костела Иисуса Милосердного: здесь выстроилась цепь из 20 человек. Люди держали цветы, свечи, плакаты с портретом умершего парня.

Через несколько минут к горожанам подъехало несколько милицейских микроавтобусов. Люди спрятались в костеле. Не обошлось без задержаний, сообщает «Белсат».

Минутой молчания Романа Бондаренко почтили витебские медики и студенты медуниверситета.

Напомним, Роман Бондаренко вышел во «двор перемен» в Минске вечером 11 ноября, когда неизвестные в масках приехали на тонированных бусах снимать бело-красно-белые ленточки с забора.

Началась потасовка. Очевидцы говорят, что Романа с силой оттолкнули, он ударился головой. Потом парня увезли на микроавтобусе. Через полтора часа избитого доставили в больницу скорой медицинской помощи с отеком мозга. Была операция, молодой человек находился в критическом состоянии до вечера четверга. Вечером 12 ноября он умер.

Вечер в поддержку избитого Романа Бондаренко на «Площади перемен» превратился в вечер его памяти. Больше пяти часов люди ехали со всего города во двор на Червякова – Сморговском тракте, это продолжалось до полуночи.

Татьяна Матвеева
TUT.BY

ЗДАРЭННІ

ПАЖАРЫ І ДТЗ Ў ВІЦЕБСКІМ РАЁНЕ

Пералік здарэнняў за лістапад у Віцебскім раёне складаецца з пажараў і дарожна-транспартных здарэнняў.

Пажар з гібеллю чалавека адбыўся раніцай 1 лістапада ў садовым таварыстве «Хімпласт» каля вёскі Друкава Віцебскага раёна.

Паведамленне пра ўзгаранне садовага доміка па 2-м Цэнтральным завулку выратавальнікі атрымалі ў 05:22 раніцы. Калі першыя экіпажы пажарных прыбылі да месца выкліку, у палаючым будынку ўжо абрынуліся дах і столь. Падчас тушэння пажару пад абваленымі канструкцыямі дома пажарныя знайшлі цела 77-гадовай гаспадыні ўчастка. У выніку пажару ў дачным доме агнём былі знішчаныя дах і столь, а таксама маёмасць. Пажарныя высвятляюць прычыны пажару.

Увечары 1 лістапада паблізу пасёлка Віцьба Віцебскага раёна адбылося ДТЗ. 43-гадовы кіроўца аўтамабіля Renault Laguna збіў 60-гадовую жанчыну, якая пераходзіла дарогу па-за пешаходным пераходам. У выніку ДТЗ жанчына атрымала цяжкія траўмы і была шпіталізаваная ў рэанімацыйнае аддзяленне бальніцы, дзе пазней памерла. Вядома, што святлоадбівальні элементамі яна пазначаная не была.

У Віцебскім раёне Renault ўляцеў у дрэва: 18-гадовы пасажыр атрымаў розныя траўмы і дастаўлены ў рэанімацыю.

Пасажыр атрымаў сур'ёзныя траўмы пры сутыкненні аўтамабіля з дрэвам пад Віцебскам, паведамілі ў ДАІ. Аварыя здарылася ноччу 9 лістапада ў раёне вёскі Саўчэнкі Віцебскага раёна. Папярэдне ўстаноўлена, што 20-гадовы кіроўца Renault Logan не справіўся з кіраваннем і выехаў за межы праезнай часткі, дзе аўтамабіль ўрэзаўся ў дрэва.

Увечары 17 лістапада ў Янавічах Віцебскага раёна аўтамабіль збіў жанчыну. 32-гадовы кіроўца Opel Astra збіў 55-гадовую жанчыну, якая пераходзіла дарогу паза пешаходным пераходам. Пацярпелую шпіталізавалі.

У пасёлку Віцьба Віцебскага раёна гарэла шматпавярхоўка.

Пажар адбыўся ў кватэры, размешчанай на першым паверсе. 23 лістапада 2020 у 12-57 у службу выратавання Віцебска паступіла паведамленне аб пажары ў кватэры па вуліцы Цэнтральнай у пасёлку Віцьба Віцебскага раёна.

На падлозе ў калідоры выратавальнікі выявілі 48-гадовага гаспадара памяшкання. Мужчына знаходзіўся ў стане непрытомнасці. Пацярпелага шпіталізавалі з атручваннем прадуктамі гарэння.

У выніку пажару ў кватэры закураны сцены і столь, пашкоджана маёмасць. Эксперты высвятляюць прычыну ўзгарання. Разглядаецца версія – неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні.

А.Адамаў

ВЫСТАВА

В БИБЛИОТЕКЕ – ВЫСТАВКА РИСУНКОВ

В Мазоловской сельской библиотеке проходит выставка детских рисунков «Очарование закатом» Анастасии Антоненко.

Настенька является активным читателем библиотеки и талантливой участницей кружка Мазоловского дома культуры «Магия творчества». Девочке 9 лет, она учится в 4 классе и живет в деревне Хайсы Витебского района.

Увидев работы Анастасии, я восхитилась талантом юной художницы. Больше всего удивляет даже не возраст девочки и качество ее работ, а тот факт, что всему этому она научилась сама.

Рисовать Настя начала с трех лет. Как только взяла кисточку в руки, на желание матери подправить что-то, отвечала: «Я сама...». С тех пор она рисует когда и что захочет, стремится красками передать внутренние эмоции и свое мироощущение. В рисунках Анастасии нет ничего выдуманного. В них переданы особое, неповторимое видение мира и чуткая восприимчивость. В творчестве юной художницы господствует линия – летящая, стремительная, чистая.

Сейчас для школьницы живопись и рисование только хобби, но кто знает, может быть в будущем Анастасия Антоненко станет профессиональным художником.

Приходите на выставку и сами убедитесь в том, какие замечательные художественные работы здесь представлены.

А. Магон

АБ'ЯВА

Каб атрымліваць кожны нумар газеты "Дзвінскі Ўзгорак" паведаміце рэдакцыі аб гэтым. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то патэдэфануйце.


Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты "Дзвінскі Ўзгорак".

Наша газета стала размяшчацца на партале http://kamunikat.org, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

ШТО СУЧАСНЫМ ЭКАНОМІКАМ ДОБРА, ДЛЯ БЕЛАРУСКАЙ МАДЭЛІ — СМЕРЦЬ

Парламент, выбары, праваахоўныя органы — усе гэтыя абавязковыя інстытуты сучаснай дзяржаўнасці ў нас быццам бы існуюць, вось толькі скарыстацца іх паслугамі ў адпаведнасці з Канстытуцыяй чамусьці не атрымліваецца.



Тыя, каму належыць ахоўваць парадак, бяруць прыклад са злачынцаў і хаваюць свае твары пад маскамі. Чальцы камісіі па падліку галасоў не вывешваюць выніковых пратаколаў і таемна пакідаюць участкі для галасавання праз запасны выхад. Сам быў сведкам падобнага. Дэпутаты, якія засядаюць у Палаце прадстаўнікоў, ні маіх інтарэсаў, ні інтарэсаў маіх шматлікіх знаёмых не прадстаўляюць. Але ўсе пры справе — адпаведна, і пры зарплаце.

Беларуская мадэль ва ўмовах палітычнай канкурэнцыі не ўзнаўляецца. На 70 тысяч чальцоў участковых выбарчых камісій туды ўвайшлі 6 чалавек ад апазіцыйных палітычных партый — і не праз нейкую памылку, недагляд або загадзя спланаваную правакацыю. Не, усё значна прасцей. Як і кожная сацыяльная структура, якая аднойчы сфарміравалася, беларуская мадэль банальна імкнецца выжыць. *Яна грае як умее. Патрабаваць ад яе штосьці іншае — бессэнсоўна…*

Адступаць няма куды, а наступаць ёсць куды

Ад палітыкі час перайсці да эканомікі, і пачну я з наступнага жыццесцвярджальнага акорду: «Ад сістэмнага руху наперад мы не адступім. Не за гарамі новая пяцігодка, якая мусіць стаць для Беларусі прарыўной. У бліжэйшыя гады краіна павінна ўвайсці ў шосты тэхналагічны ўклад, што азначае далейшае эканамічнае развіццё дзяржавы: уласная энергетыка, экалагічная і канкурэнтаздольная вытвор-часць, высокая, на ўзроўні сусветных стандартаў, якасць беларускай прадукцыі».

Пра тое, каб «дагнаць і перагнаць» развітыя краіны, марыў яшчэ правадыр сусветнага пралетарыяту, чые помнікі ўпрыгожваюць галоўныя плошчы беларускіх гарадоў. Сваёй марай ён падзяліўся ў артыкуле з сімвалічнай назвай «Катастрофа, якая пагражае, і як з ёй змагацца».

Прызнаюся, я не знайшоў часу, каб асвяжыць у памяці ленінскія прапановы па барацьбе з катастрофай, якая пагражала. Час — гэта грошы. Навошта яго марнаваць на мінулае, калі сучаснасць такая багатая на арыгінальныя ідэі.

Ядро шостага тэхналагічнага ўкладу, калі хто забыўся, складаюць разнастайныя «нана»: нанаэлектроніка, нанахімія, нанафатоніка, нанаматэрыялы, нана-біятэхналогіі і г.д. Наш шлях у свет «нана» залежыць, перш за ўсё, «ад эфектыўнасці працы кіраўніцтва сілавых структур», на якія ўскладзена задача па «забеспячэнні стабільнасці і дабрабыту нашых людзей».

Дабрабыт — шматзначны тэрмін, асноўным значэннем якога з’яўляецца росквіт, забяспечанасць, спакойнае і жыццё ў дастатку. Для таго, каб усё пералічанае самым бліжэйшым часам увасобілася ў жыццё, кіраўнікі сілавых структур абавязаныя няўхільна выконваць наступнае патрабаванне АП: «З сённяшняга дня, асабліва ў кватэрах грамадзян, куды яны (“майданутыя” і “пратэстуны”. — С. Н.) хаваюцца, мы ў палон нікога не бярэм. Калі хтосьці дакранецца да вайскоўца, ён павінен сысці адтуль як мінімум без рук. Я кажу гэта публічна, каб усе разумелі нашу далейшую рашучасць. Далей усё. Нам адступаць няма куды, і мы адступаць не збіраемся. Хто гатовы — будзем дзейнічаць».

Адступаць няма куды, а наступаць ёсць куды. Трымці, шосты тэхналагічны ўклад! Ты асуджаны! Ад сістэмнага руху наперад мы не адступім! Нездарма ж кажуць, што ў нанатэхналогіях мае поспех той, хто ўмее працаваць галавой. Што тычыцца рук, то яны ў гэтай справе — не памочнікі.

Тройчы мае рацыю прэм’ер-міністр

Сваё ўменне працаваць галавой днямі прадэманстраваў прэм’ер-міністр Беларусі, які адгукнуўся на адкрыты ліст беларускіх і расійскіх эканамістаў з прапановамі па рэфармаванні беларускай мадэлі.

«Мы чуем вельмі шмат парадаў ад эканамістаў, незалежных эканамістаў, як будаваць эканоміку Беларусі. Мы радыя ўсім парадам, толькі галоўнае, каб яны былі канкрэтныя і прыземленыя, а агульныя рэцэпты з падручнікаў для першага-другога курсу эканамічных ВНУ, прабачце, не трэба», — пракаментаваў кіраўнік урада.

Сярод аўтараў ліста — навуковец з сусветным імем, экс-галоўны эканаміст Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця (2015–2019), а ў цяперашні час прафесар у Парыжскім універсітэце сацыяльных навук Science Po Сяргей Гурыеў. Што ж ён і яго калегі параілі беларускаму ураду?

Спіс з адзінаццаці прапаноў не з’яўляецца таямніцай. Для разумення большасці з іх не патрэбныя ведаў, якія выходзяць за межы «падручнікаў для першага-другога курсу эканамічных ВНУ». Што новага і арыгінальнага, напрыклад, утрымліваюць пункты 2 («незалежнасць судовай сістэмы ад іншых галін улады») і 4 («стварэнне роўных і спрыяльных умоў гаспадарання для ўсіх прадпрыемстваў незалежна ад формы ўласнасці, памеру або галіны»).

А якая практычная карысць беларускай мадэлі можа быць ад пункта 5 («павышэнне эфектыўнасці кіравання дзяржпрадпрыемствамі»), які змяшчае рэкамендацыю падзяліць функцыі дзяржавы як уласніка і рэгулятара? Хіба хто-небудзь з чальцоў урада пярэчыць супраць такога падзелу? Падніміце архівы. Ужо гадоў 10–15 ніхто не пярэчыць.

Тройчы мае рацыю прэм’ер-міністр: ні адну з парадаў немагчыма аднесці да канкрэтных і прыземленых. Праблема, аднак, не ў нізкай кампетэнтнасці дарадцаў, не ў іх адарванасці ад жыцця, а ў своеасаблівасці беларускай мадэлі. У сваім развіцці за чвэрць стагоддзя яна так і не здолела адпавядаць патрабаванням, апісаным у падручніках для першага-другога курсу эканамічных ВНУ. І прычыну гэтага не варта шукаць у недастатковым узроўні адукацыі яе аўтараў.

Адважуся сцвярджаць, што эфектыўнасці беларускай мадэлі так званыя «развітыя краіны» павінны зайздросціць, бо эфектыўнасць ёсць паказчык здольнасці дасягаць акрэсленых мэтаў. Галоўнай жа мэтай аўтараў беларускай мадэлі з’яўляецца... утрыманне ўлады. Будзе ўлада — будзе і дабрабыт. Зразумела, не для ўсіх, але чые гэта праблемы?

Што да разумнікаў, дык не забароніш жа ім рыхтаваць прапановы па рэфармаванні беларускай мадэлі. Неабходна толькі памятаць: тое, што сучасным эканомікам добра, для беларускай мадэлі — смерць.

Сяргей Нікалюк
“Новы Час”

ЗВАРОТ ДА МІНІСТЭРСТВА

«СЕГОДНЯ ИДЕОЛОГИЯ ГОСУДАРСТВА ПРЕСТУПИЛА ПРИНЦИПЫ ОБЩЕЧЕЛОВЕЧЕСКИХ ЦЕННОСТЕЙ

«Разве можно плодотворно и творчески в страхе учить детей? Нет!» Педагоги Беларуси написали эмоциональное обращение в Министерство образования, в котором сравнили то, что происходит сейчас в стране с фашизмом.

— Последние месяцы политика государства — это насилие, вранье, беззаконие. Разве может учитель поддерживать такую политику? Сегодня идеология государства преступила принципы обще-человеческих ценностей, она близка к фашизму.

«Фашисты стремятся к установлению полного и неограниченного контроля государства над всеми сферами общественной жизни. Склонность фашистам к террористическим методам управления обществом проявляется в нагнетании атмосферы страха и бессилия в обществе, проведении массовых репрессий, жестоком подавлении любого инакомыслия», — приводят учителя определение из учебно-методического посо-бия.

Педагоги заявляют, что на них «оказывается моральное давление со стороны администрации учреждений образования за выражение несогласия с идеологией государства» вплоть до увольнения.

— Сегодня в нашей стране происходят события, которые нельзя не замечать, не слышать, оставаться равнодушными к ним. На улицах наших городов совершается насилие над мирными гражданами. Насилие со стороны государства.

Мы слышим с экранов государственных теле-каналов о преступных приказах против народа РБ. Мы видим, как неизвестные люди в балаклавах без опознавательных знаков творят беззаконие и остаются безнаказанными. Они хватают мужчин, женщин, детей. Они бьют, калечат, убивают угрожают, оскорбляют мирных граждан всего лишь за реализацию права, гарантированного им Конституцией.

Сегодня мы не можем молчать. Многие учителя боятся высказать свое мнение, боятся потерять работу, боятся за своих учеников, боятся за свою жизнь и жизнь близких людей. Разве можно плодотворно и творчески работать в страхе? Нет!" — уверены педагоги.

Они требуют защиты своих прав, прекращения давления, восстановления на рабочих местах педагогов, уволенных по политическим причинам, и освобождения людей из заключения за выражение гражданской позиции на мирных акциях протеста.

Также учителя присоединяются к народным требованиям остановить насилие на улицах, освободить всех политзаключенных и признать выборы 9 августа недействительными.

В настоящее время обращение уже подписали более 200 человек.

“Салідарнасць”
gazetaby.com

РАБІ ДАБРО!

«ДАБРО ЦЯПЕР — ГЭТА ПРАТЭСТ»

Падзеі вакол нас даўно ўжо набылі біблейны характар. Нават нерэлігійны чалавек, угледзеўшыся, лёгка заўважыць: тут сапраўды ідзе не палітычная барацьба, а змаганьне, даруйце за патас, Дабра са Злом. Нейкім незаўважаным, але пераканаўчым чынам канфлікт з палітычнага імкліва пераўтварыўся ў маральны.

Калі прыняць за маральную норму патрабаваньні рэжыму, цяпер у нас зьяўляецца злачынствам: памятаць сваіх мёртвых, ушаноўваць іх памяць кветкамі, даваць прытулак тым, хто ў небясьпецы, падвозіць ваду тым, хто яе ня мае, казаць праўду, абараняць затрыманых ці звольненых калег і сваякоў, заклікаць да спыненьня гвалту, апэляваць у сваіх патрабаваньнях да народу.

Наадварот, правільным і ўхвальным зьяўляецца: ілгаць, ілжэсьведчыць, кідаць сваіх у бядзе, біць нагамі памінальныя лямпадкі, выдаваць тых, хто схаваўся ад небясьпекі, зачыняць дзьверы перад тымі, хто баіцца. Калі царква заклікае не апаганьваць памяць мёртвых — ёй загадваюць заткнуцца. Калі, наадварот, царква ўхваляе гвалт над людзьмі — ёй даюць месцы ля мікрафонаў. Калі доктар выказвае спачуваньне і міласэрнасьць да зьбітага — доктара звальняюць з працы. Калі доктар у ІВС штурхае нагой спакутаванага — ён застаецца працаваць.

Каб зрабіць кар’еру сёньня, трэба быць: жорсткім, хлусьлівым, амаральным, бессардэчным. Каб гарантавана страціць працу, трэба быць праўдзівым, неабыякавым, прыязным да людзей. Ты можаш нават ня мець з сабой сьцягоў, не дэкляраваць палітычных патрабаваньняў, ты можаш проста прынесьці кветкі на месца забойства — і ты будзеш злачынцам. А можаш раскідаць кветкі нагамі — і ты будзеш паслухмяным грамадзянінам. Дый наогул, ты можаш абылгаць мёртвага — і выдаваць сябе за ікону маралі. А можаш прад’явіць людзям праўду насуперак гэтай ілжы — і справакаваць забарону на праўду для ўсіх.

Ня ведаю, ці заўважаюць гэта тыя, хто сёньня трымае на сваіх плячах былую ўладу: як лёгка і як беспаваротна яны звальваюцца ў маральную бездань. Вось ты судзьдзя, неблагая, напэўна, дзяўчына, харошая дачка харошай мамы, але ты проста вынесла прысуд на падставе ілжэсьведчаньняў, якія даў невядомы ані табе, ані іншым Іван Іванавіч Іваноў — опа, і ты ўжо на баку Зла. Здаецца, проста выконвала сваю работу (потым так і скажаш). Але дабро і зло ня ведаюць межаў паміж работай і не-работай. Немагчыма быць на працы са Злом, а дома з Дабром. Так проста не бывае. Шчэ ў палітыцы можна падтрымліваць аднаго, а працаваць на іншага, без праблем. А з дабром і злом такія жарцікі не праходзяць. Ты альбо там — альбо там.

Мне падаецца, я разумею цяперашнюю беларускую Салідарнасьць — салідарнасьць маштабную, касьмічную, салідарнасьць, якая ня мае меры і межаў. Дабро цяпер — гэта пратэст. Што б ты ні рабіў добрага — ты ўжо пратэстуеш. Прывёз вады — пратэстуеш. Аднавіў паламаную чорнымі людзьмі мэблю — пратэстуеш. Пусьціў памыцца ці адпачыць незнаёмца — пратэстуеш. Не схлусіў — пратэстуеш. Абараніў слабога — пратэстуеш.

Ну можна зрэзаць усе стужачкі, разьбіць усе лямпадкі, пасадзіць усіх з вуліцы, забараніць партрэты Рамана Бандарэнкі. Можна. Але з Дабром — што рабіць? Як ты яго забароніш? Нават калі жыцьцё пакласьці на гэта — ну ніяк.

І менавіта таму ў гэтым канфлікце перамога — прадвызначаная. Ну так, Зло, бывае, выйграе ў тактыцы. Нават найчасьцей так і бывае — тактычна Зло і больш хітрае, і больш жорсткае, і часьцяком лепей аплочваецца. Але стратэгічна ў Зла няма ніякіх шансаў. І ня проста таму, што так напісана ў Бібліі. А таму, што чалавецтва, каб выжыць і не пажэрці адзін аднаго, ад самага свайго пачатку вымушана трымацца Дабра. Голы практычны сэнс.

А беларусы людзі практычныя.

Хочацца расказаць напрыканцы адну праўдзівую гісторыю. Адна мая знаёмая настаўніца прыйшла ў панядзелак на ўрок зьбітая, зь вялізарным сіняком на твары. На нядзельным маршы яна кінулася бараніць чалавека, якога цягнулі ў бус, і яе ўдарыў у твар амапавец. Дзеці, натуральна, успалашыліся: што з вамі? Яна шчыра расказала, як было.

А назаўтра яе выклікаў дырэктар і голасам прарока пратрубіў у яе разьбіты твар: «Мне сёньня патэлілі з аддзелу адукацыі! Туды паступіў сыгнал, што вы ўчора на ўроку сказалі дзецям праўду!»

Мы ішлі зь ёю поплеч па праспэкце Пераможцаў, зноў была нядзеля, зноў побач было шмат прыгожых людзей, сіняк яе цьвіў ужо жоўтым і чорным, і мы сьмяяліся.

Ганна Севярынец

svabod1.azureedge.net

НАШЫ СІМВАЛЫ

БУДУТ ЛИ ЛЮДИ В БАЛАКЛАВАХ ВРЫВАТЬСЯ В ЦЕРКВИ?

Очередной фронт гражданской войны Лукашенко открыл против национальной символики. В качестве аргумента, что он не фашист, Лукашенко заявил, что не ходит под бчб-флагом.

«... открыто говорю, что это фашистская символика... Когда у нас были бчб-шные флаги, которые у нас, Лукашенко портретов под бчб-флагами не было, а фашистов — были».

Лукашенко заявил, что не намерен терпеть «эту фашистскую символику в Минске».

«Мы уберем эту фашистскую символику из нашего общества. Сделаем это красиво и, прежде всего, разъясняя, вбивая в голову людям, что это нельзя делать».

То, что его сторонники умеют **«вбивать в голову»**, уже увидели во всем мире на примере убийства Романа Бондаренко.

На недавнем совещании со своими чиновниками Лукашенко призвал навести порядок во дворах Минска, убрать народные мемориалы погибшим мирным гражданам и срезать и закрасить бел-чырвона-белые изображения флага.

Указание развязать идеологическую и психологическую войну против национальной символики — это и репрессии против огромной части нашего общества — верующих. Все православные священники во время особо праздничных дней выходят служить в одеждах с изображением бел-красно-белых лент. Белый цвет означает чистоту души Христа, а красный — кровь, пролитую Сыном Бога за грехи людей.

И что? Теперь рьяные слуги режима начнут охоту на священников? Будут арестовывать их и срезать с их одежды символы Христа?

Неужели Лукашенко думает, что верующие будут его за это благодарить?

Аргументы, что это фашистская символика, не выдерживают никакой критики. Именно под бело-красными знаменами в начале XV века воины ВКЛ громили крестоносцев под Грюнвальдом. Сходите в национальный музей, где пушка на крыльце стоит, да и детей своих туда возьмите и внучек. Там есть об этом картины.

Если следовать этой «фашистской» логике, то следует запретить у нас в Беларуси все флаги России. Ведь под ними против СССР сражалась на стороне Гитлера армия Власова.

Может, есть смысл подумать и остановить антихристову войну? Посмотрите на изображения священников с символикой Христа, поговорите со своими священниками Федором Повным и новым митрополитом. Может, они вам смогут разъяснить антихристианский смысл операции, которую вы затеяли.

А то ведь с учетом рвения ваших приближенных, которые стали убивать людей в их же дворах, следует ожидать нападений и на священников, которые в праздничном одеянии выйдут служить верующим и Богу.

Представляю, как некие особи в черном и балаклавах крадутся к священнику во время богослужения. Хватают его, укладывают на пол и начинают срезать бчб-ленточки с его одежды. А если священник сопротивляется, то его ударяют головой об пол, несут в бусик с тонированными стеклами и отвозят в милицию. А через сутки мы узнаем, что священник умер, не приходя в сознание. А вы по телевизору сообщаете, что священник демонстративно одел фашисткую символику, был пьян и поэтому туда ему и дорога!

Скажите, что у меня буйная фантазия, которая нарисовала столь фантасмагорическую ситуацию?

Отнюдь. Этот фантасмагорический сюжет был навеян как минимум следующими фактами:

1. Главу Костела в Беларуси гражданина РБ Кондрусевича не впустили в родную страну. До этого Лукашенко публично намекнул, что священник чуть ли не преступник и мошенник. Прошло несколько месяцев. Паспорт Кондрусевича подвергли тщательной проверке. И ничегошеньки не нашли. Католикам до сих не представили ни одного факта нарушения закона Кондрусевичем. Так почему его не пускают на родину? Только потому, что начальник его родины не хочет, чтобы священник тут вещал про христианские ценности и заповеди Христа, такие как «не убей».

2. После разгрома временного мемориала, посвященного убитому Роману Бондаренко, свое несогласие и оценки высказали католический епископ Юрий Кособуцкий и православный протоиерей Сергий Лепин:

«Не пойму, зачем это глумление над портретами убиенного, над цветами в его память, зачем это сатанинское попрание лампад и иконок, борьба с импровизированным мемориалом во дворе его дома, вдоль дорог? В чем смысл? Не согласовано, да? А вот такое поведение и отношение — оно согласовано? С кем?» — написал представитель БПЦ Сергий Лепин.

Дальше последовала реакция Лукашенко. Он поручил разобраться со священниками: «Хватит терпеть это издевательство! Мы рот никому не закрываем. Но говорите правду! Сказал неправду — отвечай».

Разбиралась Генпрокуратура. Епископу Минско-Могилевской архиепархии Юрию Кособуцкому и пресс-секретарю БПЦ Сергею Лепину объявлены официальные предупреждения о недопустимости нарушения закона. Генпрокуратура заявила, что высказываниям священников противоречат Конституции и закону «О свободе совести и религиозных организациях».

И последний факт. В 1995 году незадолго до референдума митрополит Филарет более часа выступл по БТ, рассказывая о ценности бчб- и иных христианских символов. При этом он был одет в праздничную одежду с бело-красно-белыми лентами.

Затем на парламентской комиссии при решении вопроса о символике Нил Гилевич спросил Филарета: «Как вы, владыка, относитесь к бел-чырвона-белым символам как символу нашего государственного флага?» Филарет ответил: «Как же я могу относиться к символу крови Христа, пролитой на белую плащеницу?! Только положительно!».

И, наконец, в те же времена в перерыве заседания Верховного Совета 12-го созыва к Филарету подошел Лукашенко и то ли в шутку, то ли всерьез предложил: «Да срежьте вы эти националистические ленточки!»

Так что православным священникам, на мой взгляд, надо серьезно готовиться к выбору своего облачения в предстоящие вскоре праздничные дни Рождества Христова: или постоять за христианские ценности, даже ценой собственной жизни, демонстрируя на своих одеждах бело-красно-белые ленты-символы, или на время царствия антихристов изменить традиции и пока не дразнить слуг дъявола.

Ибо они провели демонстративные тренировки, показав белорусам и всему миру, что овладели навыками «вбивать в голову» до потери сознания и жизни.

Владимир Подгол

naviny.by

Заснавальнік і рэдактар: Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч

Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, вул. 1-я Сененская д.5, Тэл. +375-29-218-98-38, e-mail: kas_vit@tut.by
Газета выдаецца з лютага 2014 г.

Падпісана да друку 28.11.2020 у 18.20
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца пры падтрымцы аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.